*Я.І. Клімуць*

# ВЫЯЎЛЕННЕ ДРУГОЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ ДАКУМЕНТАЛЬНА-МАСТАЦКАЙ ПРОЗЕ канца XX – пачатку XXI ст. ("ВЕСЕЛЫЙ СОЛДАТ" В. АСТАФ'ЕВА І "ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАДОМУ" В. БЫКАВА)

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

З аддаленнем у часе падзеі Другой сусветнай вайны набываюць у пэўным аспекце ўжо гістарычнае значэнне. А гэта ў сваю чаргу патрабуе не агульнага, маштабнага погляду на тое, што адбывалася на франтах і ў тыле, а дэталёвага разгляду шматлікіх гераічных і трагічных выпадкаў, вытлумачэння асновы іх з'яўлення. Можа і таму ў прозе канца 90-х гадоў XX стагоддзя з'яўлялася ўсё больш мастацка-дакументальных твораў не толькі ўдзельнікаў тых падзей, але і іх сведкаў, што патрабуе больш дэталёвага разгляду ўсіх публікацый, бо намецілася іншая крайнасць – паказваць негатывы ў такіх праявах, якіх прынцыпова не магло ўзнікнуць. Гэта датычыцца сучасных трылераў пра тыя далёкія падзеі. Такое больш датычыць пісьменнікаў, што ўжо карыстаюцца дакументамі, але з вялікай доляй домыслу.

В. Астаф'еў і В. Быкаў напісалі ў нейкай ступені падагульняючыя творы, не прэтэндуючы на шырокі ахоп падзей, а арыентуючыся толькі на ўласна перажытае, убачанае, асэнсаванае. Праўда, В. Быкаў пачынае свой расповед з дзяцінства, з радасных і горкіх дзён пачатку калектывізацыі, В. Астаф'еў – з пераможных гадоў вайны, якія сталі пераломнымі ў яго жыцці.

В. Астаф'еў пачынае аповесць рэалістычна жорстка: *"Четырнадцатого сентября одна тысяча девятьсот сорок четвертого года я убил человека. Немца. Фашиста. На войне"* [1, с. 1]. Далей ён падрабязна расказвае пра тое, як гэта адбылося, і пра сваё заўсёднае адчуванне віны, хоць быў на фронце і выканаў быццам бы свой салдацкі абавязак. В. Быкаў такіх эпізодаў не ўспамінае, бо, як неаднойчы ён адзначаў, заўсёды ўдзельнічаў у калектыўных дзеяннях, дзе нават і былі можа забітыя ім, але персанальна не пацверджаныя.

Акрамя гэтага, ёсць у іх многа пунктаў судакранання. Асноўныя – гэта выкрыццё бяздарнасці і бяздумнасці камандавання, асабліва на ніжэйшым і сярэднім узроўні, калі камандзір нейкай пэўнай часці мог расстраляць свайго падначаленага за невыкананне нейкага бяздумнага і бяздарнага загаду. Але ён звычайна ішоў зверху, на ніжэйшых інстанцыях абмяркоўваць яго было проста немагчыма, і не толькі таму, што згодна з савецкім армейскім статутам загады не абмяркоўваюцца, а выконваюцца. Не толькі ў арміі, але і ў грамадзянскім жыцці людзям было прывіта пачуццё беспярэчнага падпарадкавання. Але ж, пэўна, многае дасталося і ў спадчыну ад папярэдняга

рэжыму. У паўднёвай Польшчы за гарамі была Славакія, у армейскага кіраўніцтва была вялікая спакуса пераскочыць іх і такім чынам апынуцца ў тыле ворага, на шырокім тактычным прасторы. В. Астаф'еў піша: *"Стратегические соблазны, видимо, так живучи, военная мысль так косна и так неповоротлива, что вот и в эту, в "нашу" уже войну наши генералы, но с теми же лампасами, что и у "старых" генералов, снова толклись возле Дуклинского перевала, стремясь перевалить его, попасть в Словакию и таким вот ловким, бескровным маневром отрезать гитлеровские войска от Балкан, вывести из войны Чехословакию и все Балканские страны, да и завершить скорее всех изнурившую войну"* [1, с. 2]. Відавочна, што пісьменнік асуджае вось такую стратэгічную непаваротлівасць, у нейкай ступені нават зацыкленасць. Жыцці простых салдат, нават сярэдніх камандзіраў не браліся ў разлік: у Расіі мужыкоў хопіць. Нешта падобнае адзначае і В. Быкаў. Ён піша пра тое, як у сорак чацвёртым выграбалі ў вызваленых вёсках усіх мужчын і без дастатковага ўзбраення, без падрыхтоўкі, нават без абмундзіравання кідалі ў бой: *"Абмундзіроўкі няма, і яны так, у хатняй апратцы, зь "сідарамі" за сьпіной ідуць у ланцуг – атакаваць суседняе сяло. Няшмат, аднак, даходзіць да таго сяла. Тады пачынаецца ўсё спачатку"* [2, с. 59]. З горыччу пісьменнік зазначае далей: *"Таму столькі ў нас цяпер "неизвестных солдат", "пропавших без вести". Такі быў улік. У пяхоце не было ніякага ўліку. Во кулямёты ўлічвалі, гарматы, танкі. Нават снарады начальства лічыла, бо за іх адказнасьць мела. А за людзей адказваў адзін Гасподзь Бог..."* [2, с. 59].

Гэта што датычылася тактыкі і стратэгіі вялікай вайны, дзе хоць уяўна імкнуліся паказаць нейкі парадак, хай сабе і без чалавечага фактару. А што здаралася, калі салдат выбываў са строю, прытым не забіты, бо гэта лёгка спісвалася, а паранены. Якія пакуты прыходзілася перажываць гэтым тысячам людзей? Яны для начальства ўжо не лічыліся стратэгічным матэрыялам, а ператвараліся ў нішто. Добра, калі пападалі ў стандартныя шпіталі ў вялікіх гарадах, дзе персанал быў падрыхтаваны, этычна выхаваны, помніў пра дадзеную клятву. А калі ў часовыя медсанбаты, розныя размеркавальнікі? Яны ўжо нікому не былі патрэбныя. Пра свае шпітальныя вандраванні В. Быкаў не надта любіў пісаць, аднак у мемуарах адзначаў: *"Што ўжо казаць пра франтавыя шпіталі, пра якія няраз з болем і гневам пісаў Віктар Астаф'еў. Галоўнае шпітальнае лякарства – іхтыёлавая мазь, чорная сьмярдзючая мазюка, якой мазалі ўсе раны"* [2, с. 77]. Не лепшым было і звычайнае абыходжанне. У раненых ужо не бачылі патрэбных людзей, таму былі і такія адносіны: *"Афіцэраў усё ж імкнуліся разьмеркаваць па якіх-небудзь будынках, салдат жа клалі звычайна ў апусьцелых за вайну калгасных аборах, кароўніках ці сьвінарніках. Трохі ачышчалі гной, слалі салому, якую*

*накрывалі зьверху універсальнай салдацкай апраткай – плашч-палаткамі"* [2, с. 77]. У В. Астаф'ева пра тое ж сказана яшчэ больш жорстка: *"Безобразно доставляли раненых с передовой в тыл. Выбыл из строя – никому не нужен, езжай, лечись, спасайся, как можешь"* [1, с. 5].

Трэба адзначыць, што абодва творы вызначаюцца адкрытай публіцыстычнасцю. Не надта звяртаецца ў іх увага на пейзаж, псіхалагічную матывіроўку ўчынкаў герояў. Галоўная ўвага канцэнтруецца на саміх падзеях. І В. Астаф'еў, і В. Быкаў пры раненнях адчулі да сябе самую звычайную абыякавасць, хоць былі і рознага рангу: В. Быкаў – малодшы афіцэр, В. Астаф'еў – радавы.

Пра перыферыйныя шпіталі В. Астаф'еў пісаў таксама без вялікага піетэту. Ён паказвае, што там атабарыліся ў асноўным прыстасаванцы тыпу падпалкоўніка медыцынскай службы Чарняўскай, яе падпятніка старшыны Уладыка. Ёй даюць адпор параненыя, якія пабачылі на фронце ўсе жахі. Ацэнку такім "героям", як Чарняўская, дае ранены Анкудзінаў: *"А, с-сука! А-а, тварь! Наворовалась за войну, на...блась досыта! Крови солдатской напилась и права качает. А-а-а..."* [1, с. 15].

Пісьменнік заўсёды стараецца быць аб'ектыўным. Жальбы раненых пачулі, шпіталь расфарміравалі, да начальства прымянілі строгія меры. Але наўрад ці яна і далей не займала падобных пасад. Істотна іншае: сотні раненых на гэты раз былі выратаваныя. Але ж гэта адзіны выпадак з тысячы. Ці не таму ў Савецкім Саюзе было столькі загінуўшых?

Увогуле ў гэтых творах вайне адведзена толькі зусім невялікая плошча, але старонкі твораў уражваюць.

## Літаратура


1. *Астафьев, В.* Веселый солдат / В. Астафьев // Роман-газета. – 1999. – № 6. – 95 с.
2. *Быкаў, В.* Доўгая дарога дадому / В. Быкаў. – Мінск: ГА БТ "Кніга", 2004. – 544 с.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова